Праваабаронцы за свабодныя выбары

(//spring96.org) (http://www.belhelcom.org)



Коней на пераправе не мяняюць. Хто ўзначаліў абласныя выбарчыя камісіі па рэферэндуму?

27.01.2022



(//spring96.org/files/images/sources/grodna-referendum-karaeu.png)

Юрый Караеў на сумесным пасяджэнні Гродзенскага аблсавета і аблвыканкама. Фота: Гродненская праўда.

Прадстаўнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» паглядзелі, каго абралі старшынямі абласных камісій па рэферэндуму і ўзгадалі, чым яны запомніліся пад час іншых электаральных кампаній.

Брэсцкая вобласць

Старшынёй Брэсцкай абласной камісіі па рэферэндуму адзінагалосна абраны **Аляксандр Каляда**. Яго намеснікам стала **Вольга Дзямко,** вылучаная ад прафсаюза работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў.

Аляксандр Каляда не так даўно ўзначаліў праўленне ГА «Дынама-Брэст», але ў выбарчых кампаніях – не навічок. Больш таго, з 2007 па 2011 гады з’яўляўся сябрам Цэнтрвыбаркама.

Падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 2020 года таксама з’яўляўся старшынёй абласной выбарчай камісіі.



(https://spring96.org/files/images/sources/koleda-referendum.jpg)

Чым запомніўся? Сваім тлумачэннем, чаму на шмат якіх участках камісіі адмаўляліся вывешваць выніковыя пратаколы ў 2020 годзе.

Каляда прызнаўся, што *“такія выпадкі мелі месца. І гэта дрэнна. Асабіста я гэта звязваю гэта ў тым ліку з нездаровым ажыятажам вакол гэтых выбараў. Былі выпадкі, калі на сябраў участковых камісій аказваўся ціск, яны гэтыя пратаколы спачатку вывешвалі, потым здымалі”*.

У 2019 годзе абласная камісія пад ягоным кіраўніцтвам пакінула без задавальнення скаргу актывісткі “Еўрапейскай Беларусі” **Паліны Шарэнда-Панасюк** аб адмене рэгістрацыі кандыдатам.

Ён жа ў прысутнасці міжнародных назіральнікаў ад АБСЕ забараняў назіральніку кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” **Уладзіміру Вялічкіну** здымаць пасяджэнне камісіі.

Віцебская вобласць

Кіраваць абласной камісіяй па рэферэндуму даверылі начальніку галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага аблвыканкама **Дзмітрыю Хому.** Гэта не першая электаральная кампанія на Віцебшчыне, якая будзе праходзіць пад ягоным кіраўніцтвам: ён узначальваў абласную выбарчую камісію па выбарах Прэзідэнта ў 2020 годзе, а таксама некалькі ранейшых.



(https://spring96.org/files/images/sources/homa-referendum.jpg)

"Магу з упэўненасцю сказаць, што сябры камісіі праявілі максімум аб'ектыўнасці", - аднойчы заявіў ён.

Хома запомніўся сваімі “наездамі” на сябра абласной камісіі, праваабаронцу **Паўла Левінава**, адмовай на разгляд скаргі на пазбаўленне статуса кандыдата ў дэпутаты **Дзмітрыя Казлова** (блогера Шэрага Ката) на выбарах 2019 года.

На Віцебшчыне ўвогуле склад камісіі мала чым адрозніваецца ад складу, які праводзіў выбарную кампанію 2020 года.

Гомельская вобласць

25 студзеня тут абраны склад абласной выбарчай камісіі па рэферэндуму. Яе старшыней аднагалосна стаў кіраўнік абласнога аб'яднання прафсаюзаў, сябра Савета Рэспублікі **Аляксей Няверaў**.

Намеснікам ужо не першы раз абіраюць **Тамару Лук'яненка.**


(https://spring96.org/files/images/sources/neverau-referendum.jpg)

Няверaў – ветэран выбарчых кампаній, мае вопыт правядзення на Гомельшчыне выбараў Прэзідэнта, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Пад яго кіраўніцтвам у 2020 годзе былі адхіленыя ўсе скаргі на нерэгістрацыю ініцыятыўных груп прэтендэнтаў у кандыдаты ў прэзідэнты, і ў тым ліку **Віктара Бабарыка**.

Гарадзенская вобласць

Гарадзенцы, якія цікавяцца выбарчымі працэсамі, добра ведаюць асобу **Уладзіміра Хлябіча**. Кіраўнік раённай арганізацыі РГА “Белая Русь" узначальвае камісіі па выбарах розных узроўняў пачынаючы з 2010 года.

Ён і на гэты раз адзінагалосна вылучаны Гродзенскай абласной арганізацыяй Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь" на пасаду кіраўніка абласной выбарчай камісіі па рэферэндуму.


(https://spring96.org/files/images/sources/hliabich-referendum.jpeg)

Ягоным намеснікам прадказальна абралі **Валерыя Міронцава**, які на гэтай пасадзе таксама не першы раз.

Характэрна, што ўдзел у першым пасяджэнні прыняў памочнік Прэзідэнта - інспектар па Гродзенскай вобласці сумнавядомы **Юрый Караеў.**

Магілёўская вобласць

На першым пасяджэнні Магілёўскай абласной камісіі яе старшынёй абраны **Валерый Берастаў**, намеснікам старшыні - **Мікалай Кароцін.**

Валерый Берастаў таксама кіраваў абласной камісіяй пад час прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, а ягоны намеснік Кароцін – проста незаменны і ўдзельнічаў у выбарчых кампаніях 2016, 2017, 2019 і 2020 года.


(https://spring96.org/files/images/sources/berestau-magileu-4.jpg)

Запомніўся тым, што парушаў заканадаўства аб зваротах грамадзян. У 2015 годзе магілёўскі праваабаронца **Аляксей Колчын** накіраваў скаргу на яго незаконныя дзеянні на імя старшыні Цэнтрвыбаркама і абласнога пракурора. Праваабаронца просіў прыцягнуць яго да адказнасці за парушэнне заканадаўства, а таксама абавязаць старшыню адказваць на звароты на мове заяўніка. Справа дайшла да суда.

Мінская вобласць



(https://spring96.org/files/images/sources/taranda-referendum.jpg)

На Міншчыне старшынёй абласной камісіі па рэферэндуме абраная **Аксана Таранда**, начальнік упраўлення па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Мінаблвыканкама.

Яна ўзначальвала выбарчую камісію неаднойчы: і на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, і на выбарах прэзідэнта ў 2020 годзе.

Яе дзейнасць ставіла ў прыклад астатнім кіраўнікам абласных камісій легендарная кіраўніца ЦВК **Лідзя Ярмошына**:

> *“Хачу пахваліць Мінскую вобласць ў сілу таго, што ў іх лепшыя інфармацыйныя рэсурсы аднастайныя. Лепш за ўсё асвятляецца менавіта тэма выбараў такім чынам”*, - мудрагеліста выказалася яна.

"Праваабаронцы за свабодныя выбары" (https://referendum2022.spring96.org/be)

Dit is interessant +1 Tweet

Паведаміць пра парушэнне:
referendum2022@spring96.org (mailto:referendum2022@spring96.org)

Важныя тэлефоны

Цэнтральная камісія: **+375 17 327-19-03 (tel:+375173271903)**

Генеральная пракуратура: **+375 17 378-55-41 (tel:+375173785541)**

Пракуратура г. Мінска: **+375 17 374-23-53 (tel:+375173742353)**

Карысныя спасылкі

- rec.gov.by (http://rec.gov.by/)
- spring96.org (http://spring96.org/)
- belhelcom.org (http://belhelcom.org/)

28.02.2022

Папярэдняя аналітычная справаздача экспертнай місіі па ацэнцы рэспубліканскага рэферэндуму

27.02.2022

Рэферэндум падчас вайны. Хроніка праваабаронцаў асноўнага дня галасавання

08.02.2022

Аналітычная справаздача аб ацэнцы этапа фарміравання ўчастковых камісій па правядзенні рэферэндуму

E-mail: viasna@spring96.org (mailto:viasna@spring96.org) | Пры выкарыстаньні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая